■■■

Рэспубліканскі міжведамасны каардынацыйны савет па патрыятычным выхаванні насельніцтва адбыўся 29 лістапада ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У пасяджэнні паўдзельнічаў міністр культуры Анатолій Маркевіч. Абмеркаванне актуальных пытанняў прайшло пад старшынствам намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара Луцкага.

Асаблівая ўвага была нададзена генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны як фактару патрыятычнага выхавання насельніцтва, айчынным каштоўнасцям ва ўяўленні сучасных беларусаў і фарміраванню банка дадзеных аб'ектаў нацыянальнай спадчыны.